## № 18

### [Зварот старшыні і сакратара згуртаваньня „Узвышша“ ў Савет Народных Камісараў з просьбаю аб матэрыяльнай дапамозе]

У Савет Народных Камісараў БССР

У процэсе разьвіваньня працы перад беларускім літаратурна–мастацкім згуртаваньнем „Узвышша“ выявілася наступнае:

1) Недахват вылучаных сродкаў на выданьне часопісі і кніжніцы „Узвышша“ дзеля таго, каб да канца году выдаваць яе ў тым–жа памеры.

2) Адсутнасьць у рэдакцыі памяшканьня і платнага рэдакцыйнага апарату вымусіла згуртаваньне ў справе рэалізацыі сваіх выданьняў карыстацца за высокую кампэнсацыю (30% — 20% за прыём падпіскі, 35% за камісію) апаратам дзяржаўнага выдавецтва і кантор[ай] газэт, што выклікала павялічэньне выдаткаў водлуг прадбачаньня на 1/3.

3) Пасьпяховая рэалізацыя выданьняў вымагае таксама адпаведнага выдаткаваньня на абвесткі і рэклямаваньне.

З прычыны ўсяго вышэйпададзенага і выходзячы з меркаваньняў патрэбы далейшага пасьпяховага разьвіцьця свае працы ў галіне будаўніцтва пролетарскае літаратуры як аднэй з неабходных перадумоў дзеля культурнага ўздыму сіл, патрэбных для ўзмацненьня эканамічнага будаўніцтва краіны, згуртаваньне „Узвышша“ зьвяртаецца да Савету Народных Камісараў з просьбаю аб дапамозе яму ў працы вылучэньнем дадатковых сродкаў на часопісь і кніжніцу „Узвышша“ ў памеры пяцёх тысяч рублёў.

*1927 г. 12 ліпеня.*

Старшыня згуртаваньня „Узвышша“

Сэкратар А. Бабарэка *[подпіс]*

## № 19

### АКТ

1929 году 22 мая рэвізійная камісія Беларускага літаратурна–мастацкага згуртаваньня „Узвышша“ ў складзе старшыні камісіі тав. **Бядулі**, сябра тав. **Пушчы** і сэкратара тав. **Глебкі**, праверыўшы працу прэзыдыюму Згуртаваньня, знайшла наступнае:

1. Ідэалягічная лінія, што праводзілася прэзыдыюмам, была ў асноўным правільнаю;

2. Прэзыдыюм своечасова рэагаваў на праявы варожых поглядаў у літаратуры шляхам зьмяшчэньня ў часопісі адпаведных артыкулаў (артыкул Купцэвіча пра Цішку Гартнага і Глыбоцкага; Трыера — пра Чарота і інш.), а такжа і вусна на сходах свайго Згуртаваньня і на іншых літаратурных вечарох і дыспутах;

3. Кіраўніцтва бягучай працай з боку прэзыдыюму было выстарчальнае;

4. Пастановы і прапановы агульных сходаў сяброў Згуртаваньня ажыцьцяўляліся здавальняюча;